дом от формального выполнения определенных заданий при пассивной роли студента к познавательной активности с формированием собственного мнения при решении поставленных проблемных вопросов и задач. Цель самостоятельной работы – научить студентов осмысленно и самостоятельно работать сначала с учебным материалом, а затем и с научным материалом, заложить основы самоорганизации и самовоспитания с тем, чтобы привить умение в дальнейшем непрерывно повышать свою квалификацию.

**В. У. Рагачова,** *дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

## АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ НА ЛЕКЦЫІ (на прыкладзе дысцыпліны «Гісторыя сацыяльна-культурнай дзейнасці»)

На сучасным этапе развіцця грамадства, які характарызуецца імклівым узрастаннем аб'ёму навуковай інфармацыі, неабходны спецыяліст, здольны да актыўнага і творчага авалодання ведамі. У прафесійнай сацыяльна-культурнай дзейнасці гэта ўменне аналізаваць, тлумачыць атрыманую інфармацыю з пазіцыі асваення падыходаў да вырашэння пэўнай педагагічнай праблемы. Сфарміраваць у выпускнікоў названыя ўменні і навыкі немагчыма без павышэння ролі самастойнай вучэбнай і даследчай работы, без стварэння ўмоў для яе эфектыўнай арганізацыі. Таму задача развіцця крытычнага мыслення на аснове ўключэння студэнтаў у самастойную работу з першых тыдняў навучання застаецца першачарговай ва ўніверсітэцкай адукацыі.

Сёння самастойная работа ўключае розныя віды індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці навучэнцаў як на аўдыторных, так і пазааўдыторных занятках, накіраваных на выкананне розных заданняў па рэалізацыі вучэбнага плана пад кіраўніцтвам выкладчыка, і можа быць вызначана як мэтанакіраваная, матываваная, карэкцiруемая самім студэнтам дзейнасць [1]. У навучальным працэсе ўстановы вышэйшай адукацыі вылучаюцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

два асноўныя віды самастойнай работы – аўдыторная і пазааўдыторная. Аўдыторная самастойная работа па дысцыпліне выконваецца на розных відах вучэбных заняткаў пад непасрэдным кіраўніцтвам выкладчыка і па яго заданні. Адным з прыкладаў аўдыторнай самастойнай работы з'яўляецца яе арганізацыя на лекцыі.

Нягледзячы на працяглы тэрмін існавання, лекцыя як форма арганізацыі навучальнага працэсу не толькі не губляе свайго значэння, але і застаецца вядучай. Яна ўяўляе сабой спецыяльна арганізаваную сумесную дзейнасць выкладчыка і студэнтаў, якая праходзіць па ўстаноўленым парадку, у пэўным месцы і накіравана на вырашэнне адукацыйных задач. Сучасная лекцыя арыентавана на фарміраванне асновы для наступнага засваення студэнтамі вучэбнага матэрыялу і ўцягванне іх у самастойную вучэбна-даследчую работу. Развіццё сучаснай сістэмы вышэйшай адукацыі, гуманізацыя адукацыйнага працэсу ва ўстановах вышэйшай адукацыі, арыентацыя на асобу навучэнца, укараненне новых адукацыйных тэхналогій абумовілі з'яўленне новых лекцыйных форм навучання. Ажыццяўляючы вучэбна-выхаваўчы працэс, выкладчыкі звяртаюцца да такіх лекцый, у ходзе якіх ствараюцца ўмовы для больш эфектыўнай арганізацыі самастойнай работы студэнтаў. Часцей за ўсё выкарыстоўваюцца класічныя, праблемныя, лекцыі-дыскусіі, лекцыі-правакацыі, лекцыі аўдыявізуалізацыі, лекцыі ў форме прэс-канферэнцыі і інш. [2]. Кожны з пералічаных тыпаў лекцый мае адпаведныя педагагічныя магчымасці для рэалізацыі разнастайных відаў самастойнай работы студэнтаў. Віды і змест самастойнай работы, якая арганізуецца ў ходзе лекцыйнага занятку, залежаць таксама ад мэты і задач лекцыі, асаблівасцей зместу вучэбнага матэрыялу, ступені вучэбна-метадычнага забеспячэння кожнага студэнта і навучальнага працэсу ў цэлым, выкарыстання адукацыйных тэхналогій, колькасці навучэнцаў у аўдыторыі.

Дысцыпліна «Гісторыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» выкладаецца на першым курсе ў першым семестры. Яе мэтай з'яўляецца вывучэнне гістарычных аспектаў культуры і вольнага часу, развіцця сацыяльна-культурных установ, а таксама прымяненне гістарычнага вопыту ў сучасных умовах. Засваенне гісторыі сацыяльна-культурных працэсаў як неад'емнай часткі культуры грамадства фарміруе ў чалавека грамадзянскія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якасці, абуджае пачуццё павагі да культурных традыцый свайго народа, цікавасць да іншых культур. Гістарычнае мінулае з'яўляецца крыніцай найбагацейшага сацыяльна-культурнага вопыту папярэдніх пакаленняў, разнастайнасць форм якога, элементы вольнага часу могуць быць з поспехам выкарыстаны ў сённяшняй практыцы.

Спецыфіка дысцыпліны і яе месца ў навучальным працэсе накладаеадбітак на арганізацыю самастойнай работы студэнтаў. Трэба памятаць, што найбольш складанай з'яўляецца адаптацыя ўчарашняга школьніка да ўмоў навучання ва ўніверсітэце. Цэнтр цяжару па засваенні дысцыпліны знаходзіцца ў самастойнай рабоце студэнта як на лекцыі, так і пасля яе. Таму да асноўных задач арганізацыі самастойнай работы студэнтаў на лекцыі па дысцыпліне «Гісторыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» мы адносім: навучанне студэнта правільна слухаць і запісваць лекцыі, успрымаць іх; удасканальваць навыкі працы з вучэбнымі матэрыяламі; навучанне правілам канспектавання літаратуры, падрыхтоўкі рэфератаў, прэзентацый і дакладаў.

Арыентуючыся на прапанаваную В. В. Чэчатам тыпалогію заданняў для самастойнай работы студэнтаў на лекцыі [1], мы распрацавалі комплекс заданняў, якія спрыяюць больш глыбокаму засваенню студэнтамі дысцыпліны «Гісторыя сацыяльна-культурнай дзейнасці».

*Самастойнае выкананне студэнтамі заданняў адпаведна мэце лекцыі.* Падобныя заданні або практыкаванні не патрабуюць вялікіх часавых выдаткаў на падрыхтоўку, рэалізацыю і праверку. Заданні могуць быць рознаўзроўневымі па змесце (рэпрадуктыўнымі, рэканструктыўнымі, творчымі), вуснымі ці пісьмовымі, індывідуальнымі, групавымі або парнымі.

У межах дысцыпліны «Гісторыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» мы выкарыстоўваем наступныя заданні.

На першым курсе студэнт толькі пачынае авалодваць прафесійнай лексікай, таму адным з эфектыўных заданняў лічым *складанне слоўніка асноўных тэрмінаў*. У канцы лекцыі даецца 3–4 хвіліны на вылучэнне новых тэрмінаў, пачутых на лекцыі, і афармленне іх у слоўнік.

На лекцыі звычайна даецца шмат матэрыялу, для ўспрымання і перапрацоўкі якога неабходны час. Таму ў канцы занятку мы прапануем студэнтам *рашэнне красвордаў або адказы на пытанні* (не больш за 3) па матэрыялах лекцыі. Заданне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дазваляе студэнту прагартаць канспект ў пошуках адказаў і такім чынам яшчэ раз аднавіць у памяці матэрыял лекцыі.

Эфектыўным заданнем з'яўляецца распрацоўка студэнтамі *табліц па тэме лекцыі*, якія адлюстроўваюць, напрыклад, асноўныя формы правядзення вольнага часу беларускіх сялян у XIV–XVIII стст.

*Уключэнне студэнтаў у разнастайныя віды работы з тэкстам.* На першым курсе важна дапамагчы студэнту засвоіць навык напісання канспекта і работы з тэкстам. Таму мы выкарыстоўваем наступныя віды самастойнай работы студэнтаў на лекцыі.

*Чытанне, праверка і карэкцыя* студэнтамі ўласных запісаў у канспектах. Або ўзаемаправерка канспектаў лекцыйнага матэрыялу. Гэта дазваляе і педагогу скарэкціраваць магчымыя недакладнасці ва ўспрыманні матэрыялу студэнтамі.

Пры вывучэнні асноўных форм правядзення вольнага часу магнатаў і багатай шляхты ў XIV–XVIII стст. мы прапануем студэнтам урыўкі з паэмы М. Гусоўскага «Песня пра зубра». Ім неабходна вылучыць асаблівасці правядзення палявання ў той час. Падобнае ж заданне выкарыстоўваецца і пры вывучэнні форм правядзення вольнага часу дваран ў Расіі ў XIX ст. на прыкладзе ўрыўкаў з рамана Л. М. Талстога «Вайна і мір». Студэнты знаёмяцца з правіламі арганізацыі балю і дзейнасцю салонаў.

*Выкананне студэнтамі тэстаў.* Выкарыстанне тэстаў на лекцыі – гэта адзін з хуткіх і простых спосабаў атрымання інфармацыю аб тым, наколькі добра студэнты засвоілі матэрыялы бягучай лекцыі. Варыянтаў правядзення такіх праверак шмат: самаправерка і самаацэнка з выкарыстаннем адказаў, узаемаправерка, франтальнае апытанне і інш. На занятках па гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці мы часцей за ўсё выкарыстоўваем загадзя падрыхтаваныя тэсты, якія можна правесці пасля засваення радзела, і міні-тэсты па бягучай тэме. Яшчэ адным эфектыўным заданнем з'яўляецца распрацоўка тэставых заданняў па пытаннях лекцыі самімі студэнтамі. Пасля тэстаў абавязкова праводзіцца ўзаемаправерка і рэфлексія.

*Прэзентацыя ў ходзе лекцыйнага занятку хатняга задання.* Арганізацыя самастойнай работы ў названай форме накіравана на паўтор і абагульненне матэрыялу. У якасці хатніх заданняў па дысцыпліне «Гісторыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» мы прапануем наступныя заданні.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Падрыхтаваць электронную прэзентацыю па тэме* (напрыклад, «Асаблівасці правядзення вольнага часу ў Старажытным Егіпце», «Асноўныя напрамкі дзейнасці Смаргонскай акадэміі скамарохаў» і інш.).

Заданнем, што спрыяе больш глыбокай прапрацоўцы матэрыялу, з'яўляецца *складанне разгорнутага плана лекцыі* або складанне апорнага канспекта па структуры лекцыйнага матэрыялу.

Будучы спецыяліст павінен знаёміцца з навуковымі даследаваннямі ў галіне гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці, таму яшчэ адным з заданняў, якія мы выкарыстоўваем, з'яўляецца *прапрацоўка артыкулаў у спецыялізаванай літаратуры* і складанне на іх аснове блок-схем.

Заданні для арганізацыі самастойнай работы на лекцыі носяць універсальны характар і могуць быць трансфармаваны ў залежнасці ад мэт і задач вывучаемай дысцыпліны. Але цэласны падыход у фарміраванні навыкаў самастойнай працы студэнтаў будзе забяспечаны толькі пры сістэмным падыходзе да арганізацыі самастойнай работы, калі ўсе яе этапы і ўзроўні будуюцца на падставе агульнапедагагічных прынцыпаў, індывідуальных асаблівасцей і актыўнай дзейнасці саміх студэнтаў.


*1.* Педагогические основы самостоятельной работы студентов : пособие для преподавателей и студентов / под общ. ред. О. Л. Жук. – Минск : РИВШ, 2005. – 112 с.

*2.* Самостоятельная работа студентов : метод. указания / сост. : А. С. Зенкин [и др.]. – Саранск : Изд-во Мордов. ун-та, 2009. – 35 с.



**С. А. Руткевич,**
*доцент кафедры информационных технологий в культуре, кандидат искусствоведения*


## ИННОВАЦИОННЫЕ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЕ ТЕХНОЛОГИИ ДЛЯ СТУДЕНТОВ МУЗЫКАЛЬНЫХ СПЕЦИАЛЬНОСТЕЙ

В настоящее время перед учреждениями высшего образования нашей страны стоит задача воспитать современного человека, грамотного специалиста с широким кругозором, способ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ